УДК 63.3(2)613(4Беи)
ББК 947.084.63(476)
Ш678

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

*Рэцэнзент У. І. Навіцкі*, доктар гістарычных навук, прафесар

Шкуцько Л. Л., Сакалоў М. М.
Ш678 Яўрэйская нацыянальная культура як частка сістэмы народнай асветы на Беларусі ў 1920—1930-я гады: Вучэб. дапам. — БДПУ імя М. Танка, 2001. — 30 с.

У дапаможніку на прыкладзе становішча яўрэйскай нацыянальнай адукацыі раскрываецца распрацоўка і ажыццяўленне нацыянальнай палітыкі на Беларусі ў 1920—1930-я гады. На аснове архіўных дадзеных і навуковых публікацый прыведзены звесткі аб існаванні яўрэйскай адукацыі ў сістэме агульнаадукацыйнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школы.

Адрасуецца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, а таксама ўсім, хто цікавіцца праблемамі гісторыі міжнацыянальных адносін і адукацыі на Беларусі.

ББК 947.084.63(476)

© Л. Л. Шкуцько, М. М. Сакалоў, 2001
© Вокладка. А. А. Пакала, 2001

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Л. Л. Шкуцько,
М. М. Сакалоў

# ЯЎРЭЙСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА ЯК ЧАСТКА СІСТЭМЫ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ НА БЕЛАРУСІ Ў 1920—1930-Я ГАДЫ

*Вучэбны дапаможнік*

Мінск 2001

1923 г. "Джойнт" адкрыў у БССР 43 прафесійна-тэхнічныя вучэбныя ўстановы, забяспечыў іх абсталяваннем, а навучэнцаў — харчаваннем і вопраткай. Напрыклад, восенню 1923 г. было размеркавана 500 пар абутку, прызначаных для яўрэйскіх устаноў Беларусі. З іх прафесійнай школе "Швейпрам" было выдзелена 85 пар, Аб'яднанай прафшколе — 110, абутковай вытворчай школе — 25, прафшколе будаўнікоў — 25 і г. д. У пачатку 1924 г. Віцебская школа друкароў атрымала ад "Джойнта" тыпаграфскую машыну, а прафтэхшкола металістаў — 15 дэфіцытных для таго часу гатавальняў. Навучэнцы Беларускага рабочага тэхнікума, сярод якіх яўрэі складалі 90%, атрымлівалі ў 1923 г. рэгулярную дапамогу ад "Джойнта" ў выглядзе 240 парцыёнаў харчавання ў месяц, а таксама вопраткі, абутку, коўдраў і іншага на 200 чалавек. Грашовыя сродкі ішлі таксама на абсталяванне кабінетаў і паляпшэнне матэрыяльнага становішча навучэнцаў[1].

Наогул, ва ўсіх прафесійна-тэхнічных установах у канцы 20-х гг. да 38% навучэнцаў ад агульнай колькасці былі яўрэямі. Разам з тым, напрыклад, у Мінскай школе "Швейпрама" ўсе 157 навучэнцаў былі яўрэямі, у школе абутковай прамысловасці — са 104 навучэнцаў яўрэямі былі 99 чал., у школе паліграфічнай вытворчасці — 36 яўрэяў з 37, у дрэваапрацоўчай школе — 74 з 76, у школе металістаў — 92 са 104[2]. Гэтыя прыклады сведчаць, што яўрэйская моладзь актыўна выкарыстоўвала магчымасці атрымаць прафесійную адукацыю, уцягвалася ў вытворчую дзейнасць у розных галінах прамысловасці. Усё гэта садзейнічала змяншэнню беспрацоўя сярод яўрэйскага насельніцтва рэспублікі, паляпшэнню яго матэрыяльнага становішча.

## ЯЎРЭЙСКАЯ АДУКАЦЫЯ Ў ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ

У 1920-я гг. у Беларусі ствараецца сістэма вышэйшай адукацыі. Яна была прызначана забяспечыць магчымасць атрымання вышэйшай адукацыі прадстаўнікам розных нацыянальнасцей, задаволіць патрэбы народнай гаспадаркі, устаноў культуры, адукацыі, аховы здароўя, іншых сфер жыцця грамадства ў кваліфікаваных спецыялістах. Акрамя таго, яўрэйская моладзь у атрыманні вышэйшай адукацыі бачыла магчымасць значна пашырыць сваю дзейнасць, вырвацца з руціннага свайго існавання, лепш рэалізаваць свае духоўныя магчымасці, заняць пачэснае месца ў грамадстве. Таму яна актыўна выкарыстоўвала новыя магчымасці доступу да вышэйшай адукацыі, перш за ўсё шляхам навучання на адпаведных факультэтах ВНУ разам з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей, а таксама праз навучанне на спецыяльна створаных яўрэйскіх аддзяленнях некаторых факультэтаў.

[1] Иоффе Э. Помощь "Джойнта" в развитии образования, ученым и преподавателям на территории БССР в 20-е годы XX в. //Евреи Беларуси. Мн., 1997. С. 53—55.

[2] Вестник народного комиссариата просвещения ССРБ. 1921. № 2. С. 37.



"Палажэнне аб вышэйшых навучальных установах", якое дзейнічала ў БССР у 20-я гг., прадугледжвала роўныя правы для ўсіх грамадзян пры паступленні на вучобу, незалежна ад полу, веравызнання і нацыянальнасці. Пры стварэнні факультэта грамадскіх навук БДУ было адразу ж прадугледжана існаванне этнолага-лінгвістычнага аддзялення з цыкламі рускай, беларускай і яўрэйскай моў.

Састаўной часткай сістэмы вышэйшай адукацыі былі рабочыя факультэты, якія здзяйснялі падрыхтоўку рабочай і сялянскай моладзі да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Такія рабфакі існавалі ў Мінску пры БДУ, Горках пры Белсельгасакадэміі, Оршы і Віцебску.

З першых жа гадоў існавання рабфакаў яўрэйская моладзь складала пераважную большасць сярод іх навучэнцаў. На рабфаку Белдзяржуніверсітэта ў 1921—1922 навучальным годзе з 264 студэнтаў беларусамі былі 93 чалавекі, яўрэямі — 168; у 1922—1923 з 370 студэнтаў яўрэяў было 225, беларусаў — 131; у 1923—1924 з 398 студэнтаў яўрэяў было 216, беларусаў — 168[1]. На Мінскім рабфаку нават было адкрыта спецыяльнае яўрэйскае аддзяленне з колькасцю месцаў на 30 чалавек.

Сітуацыя некалькі мяняецца з 1924 г., калі пачала ажыццяўляцца палітыка беларусізацыі. На тым жа рабфаку БДУ ў 1924—1925 навучальным годзе са 110 студэнтаў беларусаў было 71 чал., яўрэяў — 29, рускіх — 7, палякаў — 1. У наступным, 1925—1926 навучальным годзе, на ўсіх рабфаках навучалася 863 студэнты, сярод якіх беларусаў было 518, яўрэяў — 220, рускіх — 76, а палякаў — 20[2].

У наступныя гады папулярнасць рабфакаў сярод яўрэйскай моладзі змяншалася, але і ў другой палове 20-х гг. яўрэі складалі значную частку іх студэнтаў. У 1926—1927 навучальным годзе на рабфаку ў Мінску з 380 студэнтаў было 102 яўрэі (27%), на Аршанскім рабфаку з 193 студэнтаў — 41 яўрэі (21%), на Горацкім рабфаку з 215 — 26 (12%), на Віцебскім раб-

[1] НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 57. Арк. 9.

[2] Там сама. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 321. Арк. 52—53.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ